чыстая вада твая, ачысьці цела маё грэшнае“, — чытаем у Аль-Кітабах, рэлігійных кнігах беларускіх татараў. Асабліва актыўна слова *„спадарства“* і вытворныя ад яго ўжываліся ў мове беларускае эміграцыі. Савецкія пасквілянты ўжывалі і ўжываюць гэтыя словы ў іранічна-зьдзеклівым сэнсе.

Затое беларус беларуса цяпер ужо інакш як *„спадар“* не называе.

## Спадчына

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Спадчына* — усё тое, што мы маем ці мелі.

Існае і зьнішчанае, адноўленае і створанае, прыватнае і супольнае.

*Сумная спадчына, багатая спадчына, бедная спадчына, невядомая спадчына, неабжытая спадчына.* У кожнага народа свая *спадчына* і сваё слова: па-ўкраінску *спадщина*, па-польску *spadek*, па-літоўску *paveldas*, па-латыску *mantojums*, па-расейску *наследство.*

Беларускае слова *„спадчына“* сталася вядомае ўсяму савецкаму народу дзякуючы песьняроўскай песьні на словы Купалы. Затое пра самую сваю *спадчыну* большасьць беларусаў па-ранейшаму ведае зусім мала. На пачатку XX стагодзьдзя наш народ пачаў абжываць сваю *спадчыну.* Працы Доўнар-Запольскага, Ластоўскага, Эпімах-Шыпілы, Карскага, Янчука, Ляўданскага, Шчакаціхіна, Сэржпутоўскага паказвалі беларусу, на якой *спадчыне*, на якім грунце ён мусіць стаяць у гэтым жыцьці. Але гэтыя людзі былі рэпрэсаваныя саветамі, а адкрытая імі *спадчына* замкнёная ў спэцсховах гісторыі.

Афіцыйнай *спадчынай* беларусаў былі абвешчаныя толькі рэакцыйны прыгнёт з боку польска-літоўскіх феадалаў і прагрэсыўны прыгнёт з боку расейскага царызму, а таксама курная хата, лапці, каўтун у валасах і сацыялістычны росквіт. Тыя, каго такая *спадчына* не задавальняла, падлягалі зьнішчэньню.

Канец XX стагодзьдзя і развал Савецкага Саюзу адрадзілі масавую *цікавасьць да спадчыны.* Часопіс *„Спадчына“*, клюб *„Спадчына“*, перадача Радыё Свабода *„Неабжытая спадчына“* — трывалыя парасткі вяртаньня, якія пачалі адраджаць нацыянальную сьвядомасьць. Але беларусы мелі неасьцярожнасьць абраць сабе ўзрослага *на савецкай спадчыне* прэзыдэнта. У XXI стагодзьдзе краіна ўрываецца з боем за свае годнасьць, імя, правы, за сваю *спадчыну*, у якой жыве будучыня.

## Спакуса

***Рыгор Сітніца***

Яшчэ ад тых часінаў, калі Адам адкусіў ад забароненага яблыка, слова *спакуса* неадступна перасьледуе ягоных нашчадкаў.

*Спакуса* вабіць няўцямную малечу цягнуць у рот усялякую бліскучую і прывабную дрэнь, *спакуса* кліча падлетка, навісаючы над суседзкім парканам чужымі, а значыць, і смачнейшымі яблыкамі.

*Спакуса* не дае заснуць палкім юначым мроям, прымушаючы гадзінамі прастойваць ля нейчага акна ці пад'езду, *спакуса* шчыміць пажадаю, *спакуса* вярэдзіць сквапнасьцю, *спакуса* соладка ные прагаю славы і ўлады.

*Спакуса* быць першым, абраным, багатым, самым галоўным, асноўным і